
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
Францішак БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА

Штотыднёвая газета
(Выходзіць з сакавіка 1990 г.)
◈ 25(81) ◈ 24 чэрвеня 1992 г. ◈
Кошт 20 кап.
(Па падпісцы — 10 кап.)



Я ВЕДАЮ РОДНУЮ МОВУ НА «5» —

так могуць сказаць шэсць з кожных дзесяці вучняў Ганны Мікітаўны Казлоўскай

А астатнія чатыры? На 4. Паперы строгіх інспекцый не дадуць змані́ць.

Што яна — педагог ад Бога, я пераканалася на першым жа бацькоўскім сходзе (дарэчы, сходы, якія праводзіць Ганна Мікітаўна, нагадваюць эстрадны «агеньчык» ці фальклорныя вячоркі). Дык вось, на тым першым сходзе кожны вучань быў узнагароджаны за добрае чытанне, рашэнне задач, паводзіны. Для самога віноўніка ўрачыстасці не так ужо важна, за што ўзнагароджваюць. Галоўнае, што ты, сямігадовы хлапчук, нечага варты. І гэта прызнае не сябар па футбольнай тусоўцы, а самая строгая твая настаўніца. Калі не верыце, вось вам ганаровы ліст, у якім — подпісам дырэктара! — сцвярджаецца, што ты — Саша, Ігар, Максім — нечым добрым вылучыўся ў гэтай чвэрці.

Мяне такія адносіны да дзіцяці проста ашаламілі, бо я ўжо мела сумны вопыт узаемаадносін з педагогамі свайго старэйшага сына. Тут жа быў не бацькоўскі сход, на якім дзесяць разоў мароз па скуры прабяжыць ад чарговай порцыі выкрывальніцтва заганаў і няўдзячнасці твайго дзіцяці, а ўзнёслая ўрачыстасць з нагоды персанальных поспехаў кожнага вучня.

Чатыры гады хадзілі ў школу вучні Ганны Мікітаўны так, як ходзяць на любімы фільм. У іх настаўніцы няма няздольных вучняў. Самы слабы з іх выніковую работу за пачатковую школу напісаў усяго з адной памылкай.

Клас Ганны Мікітаўны быў першым беларускамоўным у 153-й сталічнай школе. І першым стаў не толькі па ліку. Творы дваіх яе вучняў упершыню ў гісторыі школы надрукавала «Вясёлка». У конкурсе да стагоддзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча іх спектаклю не было канкурэнтаў. Па выніках раённага агляду чацвёртых беларускіх класаў яны сталі пераможцамі. Дзіва што: кожны чацвёрты ў класе — выдатнік. І кожны — непаўторная асоба са сваім незалежным мысленнем і годнасцю ў іскрыстых вачанятах.

Валянціна АРЛОВА.
Фота Уладзіміра ПАНАДЫ.

ЗВАРОТ

да кіруючых работнікаў, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ рэспублікі

У Пастанове рэспубліканскай канферэнцыі «Беларуская мова і нацыянальна-дзяржаўны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь», якая прайшла ў Мінску 15 мая г. г. з удзелам адказных работнікаў органаў дзяржаўнай улады і кіравання рэспублікі, прадстаўнікоў грамадска-палітычных і культурна-асветных арганізацый, творчых саюзаў, работнікаў розных галін сацыяльна-культурнага комплексу Беларусі, а таксама ў шэрагу артыкулаў і выступленняў у сродках масавай інфармацыі, зваротах у органы дзяржаўнай улады і кіравання грамадскіх арганізацый і асобных грамадзян, тым лікам і выкладчыкаў, студэнтаў ВНУ рэспублікі, настойліва ставіцца пытанне аб стане і перспектывах развіцця навучальна-выхаваўчага працэсу і даследчыцка-навуковай дзейнасці ў вышэйшай школе Беларусі. Выказваецца думка, што ВНУ рэспублікі павінны стаць сапраўды нацыянальнымі цэнтрамі інтэлектуальнага жыцця Бацькаўшчыны, рэальна спрыяць станаўленню нацыянальнай сістэмы адукацыі, навукі і культуры ў адпаведнасці з арт. 9 Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь і законамі рэспублікі аб адукацыі і аб мовах.

Разам з тым, у сувязі з наданнем статусу універсітэтаў (акадэмій) шэрагу былых галіновых навучальных устаноў рэспублікі, а таксама ў выніку разбурэння сістэмы адукацыі былога СССР і заканамернай адмовы ад сфармаванай ёю канцэпцыі развіцця і дзейнасці вышэйшай школы Беларусі рэальна паўстала пытанне аб яе месцы і ролі ў структуры сістэмы адукацыі рэспублікі.

Камісіяй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны створана рабочая група з ліку народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь, выкладчыкаў шэрагу ВНУ г. Мінска, работнікаў іншых галін сістэмы адукацыі па вывучэнні пытання аб мэтазгоднасці правядзення карэннай рэформы навучальна-выхаваўчага працэсу і навукова-даследчай дзейнасці і звязанай з гэтым рэар-

(Заканчэнне на с. 2).

WIS

16 мая «Выбранецкія шыхты» правялі чарговую фальклорна-танцавальную вечарыну. У ёй бралі ўдзел госці з Латвіі — гурт «Аўры», а таксама беларускія калектывы — «Голас», «Ліцвіны», «Дзянніца», «Камэлот». Прысутныя пазнаёміліся з латышскім фальклорам, павучыліся танцаваць народныя танцы.

ПОСТУП ТЫДНЯ

***СТАРШЫНЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РБ СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ НАВЕДАЎ ГРОДНА**, дзе сустрэўся з загадчыкамі аддзелаў народнай адукацыі і культуры гаррайвыканкамаў вобласці, рэктарамі ВНУ, кіраўнікамі музеяў, з якімі абмеркаваў іх праблемы. Размова ішла аб фарміраванні ў рэспубліцы нацыянальнай сістэмы адукацыі і сучаснай культурнай палітыкі.*

СТАРШЫНЯ САВЕТА МІНІСТРАЎ БЕЛАРУСІ ВЯЧАСЛАЎ КЕБІЧ НАВЕДАЎ З ПРАЦОЎНЫМ ВІЗІТАМ ШВЕЙЦАРЫЮ. Ён выступіў перад удзельнікамі пленарнага пасяджэння чарговай сесіі Міжнароднай арганізацыі працы, а таксама сустрэўся з прадстаўнікамі ААН і буйнейшых кампаній і банкаў Швейцарыі, прыняў удзел у рабоце сімпозіума «Еўрапейскі Дом».

ДЗЕВЯЦЬ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫХ ФІРМ ПА ВЫПУСКУ КАШТОЎНЫХ ПАПЕР — З ІТАЛІІ, АНГЛІІ, ФРАНЦЫІ, ДАНІІ, ШВЕЦЫІ І ІНШЫХ КРАІН ПРАДСТАВІЛІ ДЗЯРЖЗНАКУ СВАЕ МАКЕТЫ БЕЛАРУСКАГА ПАШПАРТА. У хуткім часе дзяржаўнай камісіяй будзе выбраны лепшы варыянт дакумента, а з 1 студзеня будучага года мяркуецца выдаць кожнаму грамадзяніну РБ новы пашпарт.

***ПЕРШЫ ВЫПУСК МАШЫНІСТАК,** якія валодаюць навыкамі справаводства на беларускай мове, адбыўся ў Гродзенскім міжшкольным вытворчым камбінаце № 1.*

ПАМІЖ ГОМЕЛЕМ І ВАРШАВАЙ адкрыты прамы чыгуначны шлях. Такі ж маршрут быў 74 гады назад.



Настаў час практычных дзеянняў

ПРАЧЫТАЎ допіс «Адзін — не лічачы суседа» («Наша слова», № 15), у якім У. Шапашнікаў з Ганцавіч бядуе, што ён — адзіны ў паселішчы, хто свядома карыстаецца беларускай мовай, і таму адчувае адзіноту ў акружэнні рускамоўных традыцый. У сувязі з гэтым я хачу праз «Н С» звярнуцца да Уладзіміра Шапашнікава.

Паважаны сп. Шапашнікаў! Вось прачытаў Ваш допіс і адразу ўзяўся за пяро. Калі чуеш голас такіх людзей на Беларусі, маладых і разумных, становіцца спакайней за яе лёс. Непакоіць тое, што вы на грані адчаю. Я хацеў бы падтрымаць Вас душэўна і выказаць меркаванні адносна вашых некаторых выказванняў. Справаводства на рускай мове і рускамоўная школа — гэта дрэвы, пасаджаныя многа год таму назад так званымі інтэрнацыяналістамі, праціўнікамі нацыянальнай культуры. Гэтыя дрэвы вялікія і магутныя, але толькі на першы погляд, бо — старыя, аджываюць свой век. Вы ж — саджайце маладыя. Вы ўжо пасадзілі адно дрэўца — прынцыпова загаварылі на роднай мове. Не трэба думаць, быццам «ніхто не жадае згадаць, што ён беларус і ёсць свая беларуская спадчына». Пэўна, многія згадаць гэта ў душы жадаюць, ды не ўсе гавораць аб гэтым уголас, не ўсе ўмеюць і адважыліся. Нарэшце, іншаму чалавеку не хапае штуршка, іскры, дапамогі. А вось такі, як Вы, можа дапамагчы яму. Размаўляйце заўсёды на мове беларусаў — Вы дапаможаце хоць некаторым людзям вярнуцца да сваё культуры і тым самым зробіце вялікую справу. Пазбавіцца адзіноцтва і знайсці аднадумцаў Вы проста будзеце вымушаны. А зрабіць гэта можна, дзякуючы канкрэтным справам. Напрыклад, распаўсюджваннем падпіскі на «Наша слова», пра што Вы самі здагадаліся, — бо, не чытаючы пастаянна яго ці іншае беларускамоўнае выданне, людзям значна цяжэй стаць нацыянальна свядомымі. Дарэчы, слабым месцам сённяшняга беларускага Адраджэння з'яўляецца тое, што патрыятычныя беларускамоўныя газеты і часопісы не даходзяць да кожнага беларуса. Падумайце: «Наша слова» мае наклад 7152 паасобнікі! Гэта мізэр. А тым часам беларускаму селяніну падсоўваюць «Белорусскую ниву». Відаць, у вас няма суполкі ТБМ? Калі гэта так, яе трэба стварыць. Няхай туды ўвойдуць нават людзі, якія пакуль не валодаюць беларускай мовай, але жадаюць ёй навучыцца. А ў настаўнікаў беларускай мовы, пэўна, многа цяжкасцей. Сустрэнецеся, парайцеся, упэўнены: сярод іх вучняў многа патрыётаў зямлі нашай. Ідзіце з дабром, з ласкаю, тлумачце моладзі, чаго яна не разумее. Не трэба нікуды ўцякаць на радасць каму-небудзь. Ваша настойлівасць прынясе плён, а Вам — задаволенасць і прызнанне.

Прабачце, калі мой тон здасца павучальным, я ж па прафесіі настаўнік. Я ўжо ў гадах: маладосць мая прыпала на росквіт «інтэрнацыяналізму» ў СССР. Вось зараз і жыву далёка ад Беларусі. Але чытаю «Наша слова», «ЛіМ». Згодзен з ідэяй беларускіх патрыётаў, але зараз кожны патрыёт можа далучыцца да ТБМ, падтрымаць БНФ. Зараз наступіў час аб'яднання і практычных дзеянняў у абарону нацыі. Яшчэ раю Вам звярнуцца да артыкула «Толькі змаганне» Ігара Вашкевіча («Н С», № 11, 1992). Хоць і не з усімі прапановамі можна згадзіцца, але дух і напрамак правільны.

К. ЛУСТАЧ.
пас. Умба Мурманскай вобл.

Сачыненне пішуць пачаткоўцы

Відаць, для трэцякласнікаў Зацітаваслабадской пачатковай школы Пухавіцкага раёна крыху нечаканай была тэма чарговага сачынення: «Навошта нам патрэбна родная мова?»

...Яшчэ і цяпер не ўсе дарослыя могуць дакладна акрэсліць сваё стаўленне да матчынага слова. А іншыя і зусім аб гэтым не задумваюцца. Мауляў, ці ў слове справа. А як жа тады пачуццё годнасці, гонар, свядомасць?.. Пра гэта і ўспомнілі вучні пачатковай школы вёскі Зацітава Слабада, якая мае багатую гісторыю. Неаднойчы госцем вяскоўцаў быў Якуб Колас. Многія мясцовыя жыхары і зараз памятаюць, як паэт збіраў у ваколіцах грыбы, аглядаў жытнёвыя палеткі.

Цікавая і мова ў слабадскіх людзей. **Пшанічныя дровы, маркач і маркачка** (гэта пра барана і авечку), **чачотка** (каржакаватая бяроза) — гэтыя і многія іншыя словы і зараз жывуць у гаворцы пажылых вяскоўцаў. А мянушкі, прозвішчы, назвы навакольных мясцін — ляскоў-пералескаў, ручаёў, лужкоў... Праўда, цудоўныя моўныя скарбы губляюцца ў звыклай ужо «трасянцы».

...Навошта нам патрэбна родная мова?

І вось што адказваюць на гэтае пытанне зацітаваслабадскія школьнікі.

Алёша Корань: «Мы — беларусы. Наша Радзіма — Беларусь. Вывучаць родную мову трэба не толькі для таго, каб добра размаўляць на ёй, але і для таго, каб бліжэй пазнаёміцца з Радзімай...»

Праўда, цікавая выснова? Аксана Парфёнак: «Першае слова ў жыцці мы пачулі беларускае... Нашы прадзеды вывучалі родную мову. Янка Купала пісаў вершы па-беларуску. Янка Маўр таксама пісаў беларускія творы. Але гэта было вельмі даўно...»

Аксана яшчэ не ведае, якія пакуты вытрымала наша родная мова. І што прадзеды нашыя проста жылі, існавалі ў слове, са словам. Таму яно і не згублена да сённяшніх дзён, не страчана канчаткова.

Чытаю старонкі, напісаныя Воляй Шаманскай, Воляй Шышко, іншымі трэцякласнікамі. Відаць, яны ўпершыню задумаліся над складаным, няпростым пытаннем: «Навошта нам патрэбна родная мова?»

Бяда і гора ў тым, што нам даводзіцца ўгаворваць дзетак вучыць сваю родную мову, нібы чужую, замежную мову. А не рабіць гэта — нельга.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

ЗВАРОТ

да кіруючых работнікаў, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ рэспублікі

(Заканчэнне. Пачатак на с. 1).

ганізацыяй БДУ з мэтай пераўтварэння яго ў сапраўды нацыянальна-дзяржаўную ўстанову ў адпаведнасці з роляй і месцам БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА універсітэта ў сістэме айчыннай адукацыі, а таксама ў далейшым напрацоўкі канцэпцыі развіцця вышэйшай школы рэспублікі. Дзейнасць рабочай групы па выпрацоўцы матэрыялаў па рэфармаванню БДУ мяркуецца падагуліць да канца чэрвеня г. г. і ў адпаведнасці з рашэннем Камісіі Вярхоўнага Савета падрыхтаваныя ёю матэрыялы і праекты дакументаў вынесці на разгляд Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь пры абмеркаванні пытання аб ходзе выканання Закона аб мовах у Рэспубліцы Беларусь. У далейшым цяперашні склад рабочай групы мяркуецца пашырыць і накіраваць яе дзейнасць у інтарэсах рэформы ўсёй вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь.

Звяртаемся да кіруючых работнікаў розных устаноў, да выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ з заклікам усяляк спрыяць дзейнасці рабочай групы па падрыхтоўцы адпаведных матэрыялаў, прадастаўляць неабходныя звесткі, уваходзіць з прапановамі з той мэтай, каб сумеснымі намаганнямі дабіцца ажыццяўлення азначаных вышэй мэт.

Каардынаты рабочай групы: 220016 г. Мінск, Вярхоўны Савет, Камісія па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны. Тэл. 29-34-00. Кіраўнік групы прафесар Мікалай Іванавіч Савіцкі. Тэл. 21-71-50.

Рабочая група Камісіі Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны.

Канферэнцыі

ДЗЯРЖАВА ПАДТРЫМАЕ БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Сёння ў рэспубліцы выходзіць 565 газет і часопісаў. З іх толькі 138 на беларускай мове. Астатнія — або двухмоўныя, або рускамоўныя. Міністр інфармацыі адзначыў, што першачарговую падтрымку грашыма і паперай будуць мець беларускамоўныя выданні. У прыватнасці, ужо зараз дзевятнаццаць з іх (у тым ліку і «Наша слова») становяцца прыярытэтнымі. Гэта адносіцца і да літаратурна-мастацкіх часопісаў, сабекошт якіх ужо сёння ў дзесяткі разоў перавышае цану нумара. Прыярытэтным правам будуць карыстацца і выданні на мовах нацыянальных меншасцей, напрыклад, на польскай мове.

Нядаўна прайшла прэс-канферэнцыя міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Анатоля Бутэвіча. Газеты, радыё далі кароткую інфармацыю пра тое, што для ўсіх выданняў будуць створаны роўныя эканамічныя ўмовы.

Асобна абмяркоўвалася работа тэлебачання, якое пакуль што нельга назваць беларускім, бо час яго вяшчання ў эфіры складае ўсяго чатыры з паловай гадзіны, астатні ж час займаюць перадачы, што не маюць ніякіх адносін да жыцця рэспублікі. У бліжэйшы час беларускае тэлебачанне павінна перайсці на першую праграму. Змена прыярытэту дапаможа сустракацца з нашым тэлебачаннем беларусам і з Беласточчыны і з Віленскага краю.

Але ж каб наша тэлебачанне сапраўды загаварыла на роднай мове — патрэбна мяняць і кадравую палітыку, рыхтаваць нацыянальна свядомых спецыялістаў. Першыя крокі ў гэтым кірунку ўжо зроблены. Акадэмія мастацтваў пачынае рыхтаваць кадры для нацыянальнага тэлебачання.

Гаворка на прэс-канферэнцыі ішла і пра тое, што ў дзейнасці ўсіх інфармацыйных структур цалкам адсутнічае заканадаўчая база. Няма законаў аб друку, аб тэлебачанні і радыё. Ёсць толькі праект закона аб выдавецкай дзейнасці. Будучыя прававыя акты, канешне ж, «народзяцца» ў кабінетах Міністэрства інфармацыі. Але, як запэўніў Анатоль Бутэвіч, прыслухаюцца наверсе і да думкі творчых работнікаў, газетчыкаў усіх узроўняў. Хацелася б спадзявацца, што разуменне прыярытэтнасці беларускай мовы ў сродках масавай інфармацыі знойдзе ўрэшце заканадаўчую падтрымку.

Прэс-канферэнцыя паказала, што да кагорты барацьбітоў за адраджэнне нацыянальнай мовы і культуры ўслед за інтэлігенцыяй далучаюцца і «дзяржаўныя мужы».

А. КУТ.

Галоўнае — адрадзіць памяць пра сваіх абаронцаў і святых

Прачытаў артыкул-успамін «Памяць — незагойная рана» («НС», № 18), які мяне вельмі ўсхваляваў. І вось пра што ў сувязі з ім падумаў: у нас зараз шмат гаворкі пра Адраджэнне. У прыватнасці, пра рашучае адраджэнне мовы, былога правапісу, забытых слоў, назваў. Але ўсё-такі самае галоўнае ў іншым. Яно ў тым, каб адрадзіць імёны людзей, якія, не шкадуючы жыцця, змагаліся за Беларусь. Імёны тых, хто загінуў ці пакутаваў за яе. Лічу, што толькі нацыя, якая шануе загінуўшых сваіх абаронцаў, як святых, нацыянальных пакутнікаў выхоўвае новых змагароў за гонар і веліч нацыі, множыць іх шэрагі. А тыя, хто забывае сваіх абаронцаў і святых, самотна працягне нейкі час як чыйсьці «малодшы брат» і знікне ў нетрах гісторыі, пакінуўшы па сабе, можа, толькі анекдоты ў народаў-суседзяў. Таму лічу, слушную распачала газета справу адраджэння не толькі мовы, але і добрай памяці тых, хто быў закатаваны толькі за тое, што хацеў, каб жыла Беларусь. Няхай Вам дапаможа Бог!

Г. СТЭЛЬМАХ.
г. Полацк.

Для грошай — свае назвы

Ужо зразумела, што праз некаторы час Беларусь будзе мець уласную валюту. Не трэба, аднак, глядзець на гэта толькі як на мерапрыемства па ахове мясцовага рынку спажывецкіх тавараў. Грошы павінны адлюстроўваць і нашу ўласную гісторыю. Таму неабходна больш грунтоўна абдумаць і іх назву. Не трэба выдумляць або запазычваць з замежжа. Для чаго, калі ёсць гістарычная спадчына?

Аляксей БРУЙ.
г. п. Гарадзея.

Па звестках усесаюзнага перапісу 1989 г., 77,8 % насельніцтва Беларусі складаюць беларусы, з іх дзяржаўнай мовай свабодна валодаюць 89,7 %.

Толькі 22,9 % школьнікаў Беларусі маюць магчымасць у гэтым навучальным годзе вучыцца на роднай мове, а ў гарадскіх школах рэспублікі — усяго 1,7 %.

З 1991/92 навучальнага года ў вучэбныя планы шасці факультэтаў Брэсцкага педагагічнага інстытута ўведзены курс беларусазнаўства.

У 1920—30-я гады спецыяльным вайсковым сектарам Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі было падрыхтавана і выдадзена 418 найменняў падручнікаў і другой літаратуры вайсковай тэматыкі, прычым на рускай мове з іх было надрукавана ўсяго 8.

Беларусазнаўства: шляхі адраджэння

Менавіта гэтае пытанне апынулася ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў Рэспубліканскіх навуковых чытанняў па беларусазнаўству «Адукацыя. Гісторыя. Мова», якія адбыліся ў Брэсце.

ПРАВЯДЗЕННЕ іх у горадзе над Бугам невыпадкова. Менавіта тут вясною 1592 года адзначалі завяршэнне першага навучальнага года навучэнцы і выкладчыкі Брэсцкай брацкай школы, якая пакінула прыкметны след у гісторыі нацыянальнай асветы. Варта нагадаць імя толькі аднаго з яе настаўнікаў — славутага Лаўрэнція Зізанія, стваральніка першага на Беларусі і Украіне буквара.

Выхаванцы Брэсцкай брацкай школы вывучалі грэчаскую, лацінскую, старaславянскую, польскую мовы. Абавязковым было валоданне беларускай мовай, якая, паводле Статута Вялікага княства Літоўскага, з'яўлялася дзяржаўнаю.

Роўна чатыры стагоддзі мінула з той падзеі. Зноў, як і ў эпоху Л. Сапегі і Ф. Скарыны, беларуская мова набыла статус дзяржаўнай. Але, на жаль, ад моўнага плюралізму тых часоў не засталося і следу. Хваля татальнай русіфікацыі жорстка прайшлася па зямлі нашай Бацькаўшчыны ў апошнія дзесяцігоддзі. У выніку толькі 22,9 % школьнікаў Беларусі маюць магчымасць у гэтым навучальным годзе вучыцца на роднай мове, што да гарадскіх школ рэспублікі — дык усяго 1,7 %. І гэта пры тым, што, на звестках усесаюзнага перапісу 1989 г., 77,8 % насельніцтва рэспублікі складаюць менавіта беларусы, з іх дзяржаўнай мовай валодаюць 89,7 %.

Што ж адбылося з нацыянальнай школай беларусаў? Якія разбуральныя сілы прывялі яе на мяжу знікнення?

Пошуку адказаў на гэтыя няпростыя пытанні прысвяцілі свае выступленні многія ўдзельнікі чытанняў, знайшлі яны адлюстраванне і ў падасланых матэрыялах тых, хто па пэўных прычынах не змог прыняць непасрэднага ўдзелу ў абмеркаванні. Так, на думку доктара гістарычных навук Л. Лыча, карані таго, што здарылася, узыходзяць да падзей другой паловы XVIII ст., калі беларускія землі былі далучаны да Расіі. У выніку гэтага скрыжаваліся два магутныя асіміляцыйныя патокі — польскі з Захаду і расійскі з Усходу,— якія з пераменным поспехам размывалі нацыянальны патэнцыял беларускага народа аж да 1920-х гадоў.

Высвятленню асобных аспектаў гэтага працэсу былі прысвечаны выступленні навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі АН Беларусі С. Таляронка, кандыдата педагагічных навук Т. Кагачэўскай (Магілёўскі педінстытут), шэрагу іншых удзельнікаў чытанняў. Варта адзначыць у іх ліку даклад прафесара Брэсцкага педінстытута А. Майсейчыка, які звярнуўся да такой маладаследаванай праблемы, як станаўленне вясковых школ на Беларусі ў мінулым стагоддзі. На падставе архіўных звестак ён пераканаўча паказаў, што ў школах няўхільна праводзілася русіфікатарская палітыка.

Вялася таксама гаворка пра беларусізацыю дваццатых гадоў, калі сістэма адукацыі рэспублікі пераводзілася на трывалы нацыянальны грунт, а ў школах і ВНУ адраджаліся традыцыі моўнага плюралізму. Цікавыя звесткі аб выкладанні вышэйшай матэматыкі на беларускай мове ў 1920—30-я гады прывялі ў сваіх выступленнях кандыдаты фізіка-матэматычных навук, дацэнты Менскага радыётэхнічнага інстытута А. Крачкоўскі і Л. Шлома. Адзначалася пры гэтым, што нават аўстрыйскі прафесар матэматыкі Ц. Бурстын, які пераехаў па запрашэнні Белдзяржуніверсітэта ў 1929 г. на працу ў Менск, у першую чаргу ўзяўся за вывучэнне беларускай мовы і ў хуткім часе ўжо чытаў на ёй лекцыі і пісаў падручнікі. Пераканаўчы прыклад для тых, хто жыве і працуе на беларускай зямлі шмат гадоў, але так і не прыклаў намаганняў, каб авалодаць мовай народа, а зараз патрабуе дзесяцігоддзяў на яе вывучэнне ды збірае подпісы сярод бацькоў вучняў супраць адкрыцця беларускіх школ.

Дарэчы, наконт апытанняў. Доктар педагагічных навук, прафесар Менскага педінстытута Е. Андрэева слушна нагадала, што калі ў 1920-я гады вырашалася пытанне аб увядзенні рускай мовы ў якасці спецыяльнага прадмета ў навучальныя планы беларускіх агульнаадукацыйных школ, дык рабілася гэта не праз апытанне бацькоў, а ва ўзаконеным урадавымі пастановамі парадку.

Прафесар Брэсцкага педінстытута пісьменнік У. Калеснік акцэнтаваў увагу на складанай сітуацыі, у якой апынулася нацыянальная школа на акупіраванай Польшчай тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920—30-я гады, і дзейнасці сакратара Таварыства беларускай школы Р. Шырмы па яе адраджэнні. Асабліва каштоўна, што некаторыя матэрыялы, якія датычаць перапіскі Р. Шырмы з Б. Тарашкевічам у пачатку 1920-х гадоў, былі абнародаваны У. Калеснікам у час, калі Беларусь адзначала сотыя ўгодкі з дня нараджэння абодвух сваіх славутых сыноў.

У дакладзе доктара гістарычных навук, прафесара У. Навіцкага (Акадэмія навук Беларусі) была ахарактарызавана моўная палітыка, якая праводзілася ўладамі БССР у другой палове 1980-х — пачатку 1990-х гадоў, прааналізаваны прычыны, якія перашкаджаюць адраджэнню нацыянальнай адукацыі беларусаў на сучасным этапе.

Што ж патрэбна зрабіць для адраджэння нацыянальнай школы рэспублікі?

Перш за ўсё, адзначалі ўдзельнікі чытанняў, неабходна забяспечыць правядзенне ў жыццё Закона аб мовах. А для гэтага недастаткова абвясціць школу ці факультэт інстытута «беларускімі». Трэба распрацоўваць руска-беларускія і беларуска-рускія слоўнікі, рыхтаваць і выдаваць адпаведныя падручнікі і вучэбна-метадычныя дапаможнікі на дзяржаўнай мове. З многімі тэрміналагічнымі слоўнікамі па вышэйшай матэматыцы, філасофіі, паліталогіі, геаграфіі, выдадзенымі ў навучальных установах рэспублікі, можна было азнаёміцца падчас чытанняў.

Удзельнікі чытанняў падзяліліся вопытам выкладання сваіх дысцыплін на дзяржаўнай мове. Як адзначыў загадчык кафедры, прафесар А. Яцкевіч, выкладанне нацыянальнай культуры па-беларуску ў Брэсцкім політэхнічным інстытуце паказала, што студэнты станоўча ставяцца да гэтага, праяўляюць цікавасць да азнаямлення з культурнымі здабыткамі беларускага народа. На думку загадчыка кафедры Мазырскага педінстытута С. Касцяна, галоўная перашкода на шляху ўжывання беларускай мовы ў працэсе выкладання грамадска-палітычных дысцыплін крыецца ў псіхалагічнай непадрыхтаванасці выкладчыкаў, а таксама ў тым, што ў значнай часткі студэнцтва адсутнічае жаданне вывучаць мову. Загадчык кафедры дацэнт М. Кавалевіч звярнула ўвагу на пэўныя зрухі, што адбываюцца на факультэце дашкольнага выхавання Брэсцкага педінстытута, дзе агульная і дашкольная педагогіка ўжо трэці год выкладаюцца па-беларуску. Выкладчыкі вышэйшай матэматыкі ў Беларускім універсітэце (В. Ахраменка), Беларускай політэхнічнай акадэміі (Т. Сухая), Віцебскім педінстытуце (М. Радзюк) прапанавалі неадкладна пачаць падрыхтоўку на дзяржаўным узроўні беларускамоўных вучэбна-метадычных дапаможнікаў і распрацовак па методыцы яе выкладання для ВНУ. На неабходнасць стварэння сістэмы нацыянальнай вайсковай адукацыі звярнуў увагу ў сваім выступленні выкладчык кафедры беларусазнаўства Брэсцкага педінстытута М. Новік. Ён згадаў, што ў 1920—30-я гады спецыяльным вайсковым сектарам Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі было падрыхтавана і выдадзена 418 найменняў падручнікаў і другой літаратуры вайсковай тэматыкі, прычым на рускай мове з іх было надрукавана ўсяго 8.

Але ж задача адраджэння нацыянальнай школы не вычэрпваецца ўзмацненнем увагі да развіцця моў народаў Беларусі і выкарыстаннем іх у навучальным працэсе. Патрэбна ўнясенне адпаведных карэктыў і ў змест навучання. Невыпадкова, што ўдзельнікамі з зацікаўленасцю быў сустрэты даклад начальніка аддзела выкладання грамадскіх дысцыплін Міністэрства адукацыі Беларусі В. Кушнера, прысвечаны распрацоўцы канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў рэспубліцы. У працэсе яго абмеркавання выказвалася слушная думка: прыйшоў час надаць беларускай мове і нацыянальнай культуры ў рэспубліцы такі статус, які маюць расійская мова і культура ў Расіі, польская ў Польшчы, літоўская ў Літве, украінская на Украіне.

На важнасць падтрымкі адраджэння беларускай адукацыі на Віленшчыне з боку Беларускай дзяржавы звярнула ўвагу загадчык кафедры беларусазнаўства Віленскага педінстытута Л. Плыгаўка. Талерантнасць беларускай школы, яе плюралістычны характар, як адзначаў у сваім выступленні намеснік старшыні Саюза палякаў Беларусі М. Дабрынін, павінны «працаваць» на яе карысць, а не весці да страты яе нацыянальнага твару.

Немагчыма перадаць змест усіх выступленняў, заслуханых падчас чытанняў, у якіх, акрамя навукоўцаў акадэмічных устаноў і выкладчыкаў ВНУ, прынялі ўдзел настаўнікі, студэнты, працаўнікі органаў народнай асветы, спецыялісты з-за межаў рэспублікі. Удзельнікі чытанняў азнаёміліся з вопытам выкладання беларусазнаўства ў Брэсцкім дзяржаўным педагагічным інстытуце, з метадычнымі распрацоўкамі і наглядными дапаможнікамі па гэтай дысцыпліне.

Увядзенне з 1991/92 навучальнага года курса беларусазнаўства ў вучэбныя планы шасці факультэтаў Брэсцкага педагагічнага інстытута невыпадкова. Як сведчаць дазеныя сацыялагічных даследаванняў, у большасці студэнтаў і навучэнцаў адсутнічаюць элементарныя веды аб сваёй Радзіме, яе гісторыі, культуры, прыродзе. Што ж датычыць асаблівасцей нацыянальнага характару і адметных этнічных рыс беларусаў, іх традыцыйных рамёстваў і побыту, міжнацыянальных зносін паміж народамі Беларусі і іх веравызнанняў, сувязей Беларусі з суседнімі краінамі, жыцця шматмільённай беларускай дыяспары, пытанняў развіцця айчыннай грамадскай думкі, гісторыі і сучаснага стану нацыянальнай асветы, пытанняў фарміравання тэрыторыі Беларусі, багаццяў яе нетраў, гісторыі асноўных атрыбутаў дзяржаўнага суверэнітэту — герба, гімна, сцяга, нацыянальнага войска, ведаў аб традыцыйным жыллі беларусаў, іх адзенні, стравах, абрадах, гульнях — усё гэта ўвогуле застаецца па-за ўвагай вучэбных праграм. Але ж без ведання адзначанага выкананне задачы, якая пастаўлена Законам аб адукацыі, а менавіта: «Фарміраванне і ўмацаванне нацыянальнай свядомасці грамадзяніна Рэспублікі Беларусь» (арт. 4), **неажыццявіма.**

Усё гэта, як адзначалі ўдзельнікі чытанняў, робіць неадкладным станоўчае вырашэнне пытання аб уключэнні ў вучэбныя планы навучальных устаноў рэспублікі курса беларусазнаўства — дысцыпліны, вывучэнне якой давала б студэнтам і навучэнцам веды **інтэгратыўнага** характару аб Беларусі і яе народах, садзейнічала б выхаванню ў іх пачуцця сапраўднага клопату аб Бацькаўшчыне і яе лёсе.

Дарэчы, і ў 1910-20-х гг. адраджэнне нацыянальнай школы беларусаў пачыналася менавіта з увядзення ў навучальны працэс курса беларусазнаўства. Так, ужо праз тыдзень пасля абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі Народным Сакратарыятам Асветы БНР былі адкрыты ў Менску (3.04.1918 г.) курсы беларусазнаўства. У гэтым жа годзе пачалі сваю працу Вышэйшыя курсы беларусазнаўства ў Петраградзе. У арганізаваным Белнацкамам летам 1918 г. у Маскве Беларускім народным універсітэце вядучае месца заняў курс беларусазнаўства. У Менску Вышэйшыя курсы беларусазнаўства працавалі аж да 1927 года... Дарэчы, калі вярнуцца да сённяшніх падзей, дык варта нагадаць, што аналагічныя ці блізкія па зместу курсы ўжо ўведзены ў навучальныя планы амаль ва ўсіх былых савецкіх рэспубліках, цяпер суверэнных дзяржавах: напрыклад, у школах Украіны вывучэнне дысцыпліны «народазнаўства» ўведзена ва ўсіх класах з першага да адзінаццатага. Зноў спазняемся?

Улічваючы важнасць адзначанай дысцыпліны ў справе фарміравання нацыянальнай свядомасці студэнтаў і навучэнцаў і станоўчы вопыт яе выкладання, удзельнікі чытанняў прынялі рашэнне звярнуцца ў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь з прапановай аб уключэнні курса беларусазнаўства ў навучальныя планы універсітэтаў і педагагічных ВНУ, пачынаючы з 1992/93 навучальнага года.

Падчас чытанняў быў праведзены круглы стол «Нацыянальная школа: шляхі даследавання і вырашэння праблем». Матэрыялы чытанняў апублікаваны ў навуковым зборніку «Адукацыя. Гісторыя. Мова».

Удзельнікі чытанняў былі адзінадушны ў сваёй ацэнцы навуковага абмеркавання як вельмі своечасовага і карыснага. Наступныя чытанні па беларусазнаўству адбудуцца ў горадзе над Бугам у маі 1993 года.

С. А. ЯЦКЕВІЧ,
доктар філасофскіх навук, загадчык кафедры беларусазнаўства Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута.

РАСІЯ АД БРЭСТА ДА УЛАДЗІВАСТОКА?

У апошні час вядзецца палеміка, ці варта фінансаваць і трансліраваць першы канал тэлебачання з Масквы. Дык вось я — за «Астанкіна»: і майстэрства журналістаў там на ўзроўні, ды і нельга ствараць інфармацыйны голад. Толькі пры адной неабходнай умове: «Астанкіна» павінна асвятляць шырэй праблемы краін СНД і не дапускаць пры ўсім плюралізме думак адкрыта варожых выказванняў, якія закранаюць суверэнныя правы народаў і краін.

А падставы для такой перасцярогі ёсць. Кожны, хто глядзеў, напрыклад, вячэрні выпуск навін 20 красавіка г.г., мог заўважыць дзіўныя, мякка кажучы, «агаворкі» дыктара. (Здаецца, гэта не першы і не апошні раз). Калі размова пайшла пра забастоўкі на чыгунцы, яна з лёгкасцю вымавіла фразу: «Транссибирская магистраль соединяет почти всю Россию, от **Бреста** до Владивостока». Даруйце, але нават у былым СССР Брэст ніхто не адносіў да Расіі. Хіба мы зноў вярнуліся ў царскія часы, а Беларусь стала «Северо-Западным краем»?

Наогул, мяне здзіўляе тэндэнцыя некаторых расійскіх журналістаў, як і дэпутатаў, атаясамліваць тэрыторыю былога Саюза з Расіяй. Вось і ў гэтай самай перадачы дыктар сказала, што «депутаты призвали... к защите *россиян* в Приднестровье». Але якіх жа расіян? Калі грамадзян Расіі, дыпламатаў ці яшчэ каго, дык ёсць на гэта міжнародныя нормы. Можа, пад словам «расіян» меліся на ўвазе «рускія». Дык яны не расіяне, калі жывуць у Малдове ці на Украіне, і іх праблемы — гэта ўнутраныя праблемы гэтых краін. А ўсякае «паджучванне» збоку, па-мойму, толькі распальвае канфлікт.

Разумею, руская дэмакратыя яшчэ не перамагла цалкам. Але нельга дапусціць, каб яна захлынулася, каб новыя дэмакраты кіраваліся сілай, а не правам, каб адышлі ад дэмакратыі і прыйшлі, не дай Бог, да рускага вялікадзяржаўнага шавінізму ці фашызму Жырыноўскага і яму падобных. Няўжо мала ўрокаў з мінулага? Думаю, сумленныя, прынцыповыя журналісты павінны ў першую чаргу на тым жа «Астанкіна» абараніць гонар рускай дэмакратыі. Інакш сапраўды многія задумаюцца, ці не лепш трансліраваць больш аб'ектыўную «Сі-эн-эн».

А чаму б нам не паставіць узмацняльнік для прыёму ўкраінскага ТБ? (На поўдні Беларусі яго і так прымаюць). І мова блізкая, і таксама вялікая суседняя дзяржава.

Але ўсё ж у кожнага неравнадушнага беларуса перш за ўсё баліць сэрца за наша беларускае тэлебачанне. Так, некаторыя яго праграмы сталі больш цікавымі, разнастайнымі (асабліва інфармацыйныя). Але ў многім яшчэ не хапае нашаму ТБ прафесійнасці, разнастайнасці ў мантажы выпускаў ды і проста шляхетнасці. (Можа, французы дапамогуць і тэхнічным аснашчэннем, калі ўрад сапраўды зацікаўлены ў гэтым). А так хацелася б, каб беларускае слова гучала чыста і мілагучна, без калек, якія яшчэ нярэдка сустракаюцца нават у мове дыктараў, каб былі і мульцікі для дзяцей і фільмы для дарослых абавязкова па-беларуску. Пакуль што наша беларускае ТБ напалавіну рускамоўнае.

А калі ж будуць нашы карэспандэнты на роднай мове самі перадаваць апошнія навіны і з Масквы, і з Парыжа, і з Нью-Йорка? Бо не можа свабодны народ задаволіцца папяровым суверэнітэтам, не можа нават ціхі, спакойны беларус чуць раўнадушна з экрана тэлевізара хлусню пра інтарэсы расіян у Прыднястроўі ці знаёміцца з «геаграфічнымі адкрыццямі»: Расіяй ад Брэста да Уладзівастока.

Георгій ПАРАФЯНЮК.

г. Камянец.

Плённа працуе ў Маскве Таварыства беларускай культуры імя Ф. Скарыны, за дзейнасцю якога мы ўважліва і зычліва наглядаем, з якім супрацоўнічаем, публікуючы допісы сяброў у «Нашым слове». Хроніка жыцця таварыства вызначаецца цікавымі культурнымі мерапрыемствамі (канцэрты, вечарыны) і такімі важнымі справамі, як вывучэнне праўдзівай гісторыі Беларусі, барацьба за адраджэнне роднай мовы.

На старонках часопіса таварыства «Шляхам Скарыны» (№ 6) апублікаваны даклад вядомага вучонага Ю. А. Лабынцава «Актавыя дакументы, рукапісы і старадрукі ў зборах Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні».

Прапануем яго чытачам з нязначнымі скарчэннямі.

Актавыя дакументы, рукапісы і старадрукі ў зборах Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні

У нацыянальна-культурным адраджэнні многіх народаў свету значную, а іншы раз і вядучую ролю адыгрывала дзейнасць злучаных музейных ды бібліятэчных збораў, знаных у паўднёвых і заходніх славян пад назвай маціц. Яны грунтаваліся, як правіла, на прыватных калекцыях, а самі калекцыянеры-збіральнікі нярэдка рабіліся іх заснавальнікамі.

Чымся падобнай на дзейнасць маціц была праца, пачатая вядомым беларускім навукоўцам і грамадскім дзеячам Іванам Луцкевічам (1881—1919). На аснове яго калекцый 70 гадоў таму ў Вільні быў заснаваны знакаміты Беларускі музей, пра які ў былыя гады ў друку Беларусі амаль не прыгадвалася па прычынах чыста палітычных.

Велізарнае значэнне гэтага музея ў лёсе беларускага нацыянальнага Адраджэння XX ст. Запазнаўшыся з помнікамі беларускага мінулага, што былі ў зборы Івана Луцкевіча, Максім Багдановіч усклікнуў: «Гэта ёсць фундамент нашага адраджэння! Гэта і за тысячу гадоў будзе сведчыць аб нас!»

Музей валодаў найбагацейшымі зборамі старажытных беларускіх грамат, сотнямі рукапісаў і старадрукаў, што гэтак уразілі М. Багдановіча. Даследаванне экспанатаў і справаводчых дакументаў музея, якія захаваліся, уключаючы актавыя і кніжныя, дазваляюць падрабязна ахарактарызаваць ягоныя скарбы. Яны складаліся галоўным чынам з калекцый І. Луцкевіча, з таго, што было падаравана ці набыта ўжо пасля стварэння музея, у тым ліку і ў такіх буйных прадстаўнікоў беларускай культуры, як ксёндз Адам Станкевіч (у яго, у прыватнасці, была набыта рукапісная «Трыёдзь» каляровая).

Нагадваю, што музей, на думку яго стваральніка, павінен быў стаць асновай будучага Беларускага нацыянальнага музея. Ідэя гэта авалодала І. Луцкевічам яшчэ ў юнацтве, але ажыццявілі яе толькі пасля яго смерці. Арганізаваць Беларускі музей дапамог праваслаўны біскупат у Вільні, які аддаў у карыстанне патрэбныя памяшканні ў Базыліянскіх мурах. Там і размясціўся музей разам з бібліятэкай, якая з цягам часу назапасіла амаль пятнаццаць тысяч тамоў, уключаючы і збор перыядычных выданняў.

Без сумнення, найбагацейшымі аддзеламі музея былі рукапісны, старадрукаў і рэдкіх кніг. Яны грунтоўна вылучаліся з іншых збораў.

Уражвае багацце актавых дакументаў, асабліва старажытных. Перад усім трэба адзначыць старадаўнія беларускія граматы, найстарэйшыя з якіх датуюцца XIV ст. Усяго ж у музеі было 3824 грамат XIV — XIX стст., з іх датаваныя XIV і XV ст. па два дакументы, XVI ст.— больш за трыста, XVII — каля сямісот, XVIII — амаль тысяча сто, XIX — каля паўтары тысячы, не датаваных грамат прыблізна 250. Адно пергаментных грамат у музеі налічвалася 51. Сярод старадаўніх грамат асабліва прыкметны граматы пінскага князя Фёдара Іванавіча (1508 г.), граматы каралёў Жыгімонта Аўгуста, Стэфана Баторыя, Жыгімонта III, Уладзіслава І і інш.

Сярод амаль чатырохсот рукапісных кніг найцікавейшымі былі беларускія рукапісы кірыліцкага (царкоўнаславянскага) пісьма. Гэта перш за ўсё славутае Жухавіцкае Евангелле, датаванае XIV ст., Віленскае Евангелле, літургічныя праваслаўныя і уніяцкія кнігі XV — XVIII стст., чэцці-мінеі, а таксама календары, апісанні беларускіх праваслаўных і уніяцкіх цэркваў і манастыроў, метрычныя кнігі, зборы выпісак з дакументаў XVI — XIX стст. і інш.

Сярод рукапісаў лацінскага пісьма вылучаюцца польскамоўныя дзённікі і апісанні вандровак, «Гісторыя каталіцкай царквы ў Расіі» (1828 г.), каталіцкія спеўнікі, катэхізмы для беларусаў-католікоў, лацінамоўныя літургічныя кнігі, уключаючы і досыць старадаўнія.

Беларускамоўны твор Аль-Кітаб, перапісаны ў XVIII ст. арабскім пісьмом, быў гонарам музея. Зараз ён, як і шматлікія іншыя дакументальныя экспанаты, захоўваецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы АН Летувы. Гэты рукапіс, знойдзены Луцкевічам у 1915 г., спрыяў сістэматычнаму вывучэнню старажытнай беларускай мовы. Невыпадкова, што вядомы даследчык А. К. Антановіч называе гэты рукапіс «Кітабам Луцкевіча» — па імені яго першаадкрывальніка.

У адрозненне ад гэтага твора, якому прысвечаны даследаванні І. Луцкевіча, Я. Станкевіча, А. Антановіча і іншых, астатнія літаратурныя помнікі Беларускага музея не даследаваны. У свой час пра некаторыя з іх коратка пісаў В. Ластоўскі («Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі». Коўна, 1926 г.). Нельга не пашкадаваць, што гэтыя кнігі, якія з'яўляюцца найкаштоўнейшай крыніцай для філолагаў, гісторыкаў, філосафаў, музыказнаўцаў, мастацтвазнаўцаў, нават не апісаны, калі не ўлічваць інвентарныя запісы таго ці іншага рукапіснага помніка, зробленыя яшчэ ў музеі, а потым паўтораныя пры рэгістрацыі ў ЦНБ АН Летувы.

Назавём некалькі прыкметных рукапісаў. Самы старажытны з іх, датаваны 1476 г., — «Поучения огласительные» Феадора Студзіта — надта рэдкі для славянскай традыцыі літаратурны помнік, перапісаны ў Вільні па загаду пісара вялікага князя Аляксандра. Да І. Луцкевіча рукапіс трапіў ад рускіх старавераў.

«Слуцкі памінальнік» 1517 г. змяшчае шматлікія звесткі пра беларускія праваслаўныя радаводы, у тым ліку і пра знакамітых Агінскіх. У памінальніку шэраг зробленых у XVI — XVII стст. запісаў кірыліцай, на грэчаскай і лацінскай мовах, накшталт «спробы пяра», што сведчыць аб спробах выкарыстаць у беларускім кніжным асяроддзі кірыліцкую графіку для аднаўлення славянскіх тэкстаў. Трэбнік 1545 г. быў перапісаны для царквы ў Жыровічах пры двары маршалка Аляксандра Солтана, які жыў «подле места Виленского» ў Шэшкіняй. Перапісчыкам быў дыякан Ермалаі родам з Крамянца.

З беларускамоўных рукапісаў, перапісаных лацінкаю, вылучым каталіцкі спеўнік XIX ст. Сярод старадрукаў музея выданні Ш. Фіёля, Ф. Скарыны, друкарняў Вільні, Масквы, Варшавы, Лоска, Слуцка, Нясвіжа, Магілёва, Супрасля, многіх заходнееўрапейскіх гарадоў. З гэтымі кнігамі ў Другую сусветную вайну працаваў вядомы летувіскі мастацтвазнаўца Уладас Дрэма, і таму сярод іншых калекцый музея збор старадрукаў найбольш вывучаны. Значная яго частка таксама трапіла ў Фонды ЦНБ АН Летувы, дзе захоўваецца і першы нумар гэтай калекцыі — «Трыёдзь» каляровая Ш. Фіёля (прыблізна 1493 г.).

Асобную групу складалі матэрыялы, датаваныя XX ст. Да іх адносіліся архівы Беларускай Народнай Рэспублікі, Міністэрства беларускіх спраў у Літве, Слуцкага паўстання, Беларускага пасольскага клуба пры Польскім сейме, Беларускай сялянска-рабочай грамады, Беларускага цэнтра ў Летуве, Таварыства беларускай школы ў Летуве, Віленскай беларускай гімназіі і музея ў Навагрудку, беларускіх настаўніцкіх семінарый у Барунах і Вільні, беларускіх гімназій у Гродне, Радашковічах Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Навуковага таварыства імя Ф. Скарыны, Камуністычнай пасольскай фракцыі, Беларускай сялянскай партыі «Зялёны дуб», Беларускага студэнцкага саюза, архівы розных беларускіх партый, камітэтаў, фондаў, уключаючы і тыя, што знаходзіліся далёка ад Беларусі. Былі падборкі сакрэтных дакументаў і паведамленняў польскай дэфензівы аб беларускім палітычным руху, дакументы Рускага нацыянальнага камітэта ў Вільні. Да іх адносіліся таксама архівы кнігарні «Пагоня», беларускіх выдавецкіх таварыстваў і выданняў, такіх, як «Сялянская справа», «Сялянская праўда», «Беларуская справа», «Грам. Голас», «Гомап», «Крывіч», «Наперад», «Народная справа», «Вячэрняя газета», «Жыццё Беларуса», «Калосьсе», «Самапомач», «Прамень», «Шлях моладзі», «Хрысціянская думка», «Беларускі летапіс», «Ведамасці беларускія», «Нашая справа»; рукапісы і архівы нашых пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў і вучоных М. Багдановіча, Я. Купалы, М. Гарэцкага, В. Ластоўскага, У. Жылкі, М. Танка, братоў Луцкевічаў, І. Дварчаніна, Ц. Гартнага, Б. Тарашкевіча, А. Смоліча, М. Танка і многіх іншых. Без перабольшвання можна сказаць, што гэта была нацыянальная архіўная скарбніца, вывучэнне якой дазволіла б зараз высветліць многія моманты гісторыі беларускай літаратуры, палітычных, рэлігійных і культурных рухаў, дапамагло б пераасэнсаваць і напісаць гісторыю Беларусі канца XIX — XX стст. На жаль, названыя матэрыялы былі вывезены з Беларускага музея органамі НКУС у жніўні 1944 года, праз месяц пасля вызвалення Вільні ад немцаў. Ці варта казаць, што гэта стала катастрофай для беларускай навукі і культуры, для ўсёй беларускай нацыі. Супрацоўнікі Беларускага музея адразу пасля гэтай акцыі склалі спіс забраных НКУС матэрыялаў, якія неабходна шукаць, бо гэта галоўны архіў Беларусі, беларускага нацыянальнага Адраджэння.



Хто ўважліва сочыць за часопісам «Вясёлка», той ведае, чым адрозніваюцца загадкі Івана Курбекі ад твораў гэтага ж жанру іншых літаратараў. Вось і кнігай «Хітрыя літары», выдадзенай «Юнацтвам» накладам у 80 тысяч паасобнікаў, паэт сцвярджае сваю прыхільнасць да таямнічых моўных рэбусаў.

Кніжка, адрасаваная малодшым школьнікам, складаецца з чатырох частак: шарады, метаграмы, лагагрыфы, анаграмы. Для тых, хто не ведае, як разгадваць гэтыя «загадкі», аўтар дае вершаваныя тлумачэнні. Да прыкладу, пра шарады:

Слова
Са словам
Складзі —
Сэнс аб'яднаны
Знайдзі.

Загадкі ўводзяць юнага чытача ў цікавы свет падзей, з'яў прыроды, дораць дзецям мноства розных адкрыццяў.

А для настаўніка «Хітрыя літары» — своеасаблівы дапаможнік у арганізацыі пазакласнай працы, падмога ва ўдасканальванні моўных ведаў вучняў.

А. К.

Дапытлівым

Гук-пярэварацень

Калі гук [у], што ўтвораны з [в], апынаецца ў становішчы прыназоўніка, ён у пазіцыі перад галоснымі, асабліва перад [о], развівае пасля сябе другаснае [в]. Гэтае [в] з'яўляецца нібы прыставачным перад наступным галосным. Тады і пішуць: *увадно, увыйшоу, увусі.*

Такое *ув* можа атрымацца таксама іншым шляхам. Яно можа стаць на месцы так званага здвоенага прыназоўніка *въвъ*. Праўда, Я. Карскі дадае, што такога прыназоўніка няма, але вучоны гіпатэтычна выводзіць яго на падставе «паказанняў» старажытнабеларускіх рукапісных твораў. У даўніх тэкстах можна спаткаць пасля *ув* нават ъ *(увъ)* і гэты апошні часам «ператвараўся» ў літару *о*: *ни во што*. Зразумела, што пісцы глядзелі на [в] не як на прыставачны гук, а як на частку прыназоўніка. Прыкладам, у Дарчай грамаце княгіні Ганны Слуцкай, напісанай 31 мая 1492 года, чытаем: *«дали есмо увъ отчину»*. У Чэцціях 1489 года бачым: *оуъодной въре, оуъогонь* і нават *оуво сне*, а таксама *въво сне*, што Я. Карскі прапануе чытаць, як *ўво сне*. *(Працяг будзе).*

Удакладненне

У «Нашым слове» за 20 мая быў надрукаваны артыкул «Аб мове», аўтарам якога быў пазначаны Язэп Лёсік. Для мяне, даследчыка жыцця і творчасці Язэпа Лёсіка, хто падрыхтаваў яго «Збор твораў» (з 1912 па 1920 гады), гэта было нечаканасцю. Але ўважліва перачытаўшы тэкст, адразу зразумеў, што тут прыкрая памылка. Лёсік не мог быць аўтарам гэтых радкоў. Па-першае, яму неўласціва такая манера напісання, пэўныя звароты і словы. Па-другое, Лёсік ніколі не стаў бы так «разбіраць» «Жывыя Казкі» Алеся Гаруна, свайго даўняга, лепшага сябра... Па-трэцяе, у Дзісенскім, Полацкім, Лепельскім паветах ён ніколі не быў.

І ўсё ж самы галоўны аргумент знойдзены быў у газеце «Беларусь», якой маю амаль поўны камплект. Артыкул «Аб мове» быў змешчаны ў № 137 (193) за 27 чэрвеня 1920 года без подпісу. А ў наступным, 138-м, нумары «Беларусі» за 29 чэрвеня на старонцы 3 паведамлялася: «У артыкуле «Аб мове», зьмешчаным у № 137, прапушчан подпіс Я. Станкевіч».

Алесь ЖЫНКІН.

г. Менск.

Абітурыентам

ДЫКТАНТЫ

Правілы прыёму ў сярэднія спецыяльныя ўстановы і Тыповыя правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь на 1992 год распрацаваны і зацверджаны Калегіяй Міністэрства адукацыі з улікам Закона аб мовах, Закона аб адукацыі, Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускай і іншых нацыянальных моў у Рэспубліцы Беларусь.

Яны прадугледжваюць два ўступныя экзамены пры паступленні ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Адзін з іх — па беларускай мове і літаратуры (пісьмова) — праводзіцца па рашэнні прыёмнай камісіі ў выглядзе дыктоўкі, пераказу або сачынення. Асобы, якія не вывучалі беларускую мову і літаратуру, маюць права здаваць пісьмовы экзамен па рускай мове і літаратуры.

Уступныя экзамены, акрамя экзамену па спецыяльнасці, праводзяцца па праграмах, складзеных у адпаведнасці з навучальнымі праграмамі базавай (дзевяцігадовай) або сярэдняй (адзінаццацігадовай) школы.

Вышэйшая навучальная ўстанова мае права прызначыць ад трох да пяці ўступных экзаменаў, адзін з якіх па беларускай мове і літаратуры або па беларускай літаратуры. Абітурыенты, якія паступаюць у ВНУ на спецыяльнасці тэхнічныя, сельскагаспадарчыя, медыцынскія, мастацтва, фізічнай культуры, здаюць экзамен па беларускай літаратуры (вусна).

Прапануем абітурыентам праверыць свае веды паводле некаторых тэкстаў дыктантаў са «Зборніка экзаменацыйных матэрыялаў па беларускай мове за курс базавай і сярэдняй школы», складзенага супрацоўнікамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Т. С. Саўчук і У. А. Дзіско.

Іван КАЗЕЙКА,
галоўны інспектар
Міністэрства адукацыі РБ.

Слаўны з найслаўнейшых

У Італіі, у Падуанскім універсітэце, ёсць славутая «Зала сарака». У ёй размешчаны сорак партрэтаў слаўных з найслаўнейшых людзей Зямлі. Сярод іх другі — Францыск Скарына.

Так за тысячы кіламетраў ад Беларусі, у далёкай Італіі, ушаноўваецца памяць аб нашым слаўным земляку.

Пяцьсот гадоў таму назад са Скарынавых рук атрымалі ўсходнія славяне першую друкаваную кнігу. З таго часу імя і справы Францыска Скарыны свяцілі нашаму народу вераю і надзеяй у самыя цяжкія часіны айчыннай гісторыі. Бо на працягу стагоддзяў нечуваны здзек трывала Беларусь: быць радзімаю ўсходнеславянскага кнігадрукавання і не мець права выдаваць кнігі на роднай мове. Яе слова забаранялі то польскія паны, то царская самаўладства.

Але прыйшоў час, калі беларуская кніга дайшла ў самыя глухія куткі. Ёсць чым па-сапраўднаму ганарыцца сёння беларускаму друкаванаму слову.

У Літаратурным музеі Якуба Коласа ў Мінску захоўваецца кніга народнага паэта, якую браў з сабою ў палёт лётчык-касманаўт Пятро Клімук. Можна вобразна сказаць: выпушчаная з лёгкай рукі Скарыны беларуская кніга дасягнула сапраўдных вышынь. (Паводле А. Клышкі.)

Горад з легенды

Адзінаццаць стагоддзяў стаіць Полацк на стыку магутнай Дзвіны і ціхай Палаты. Ён старэйшы за Маскву і Смаленск, Мінск і Санкт-Пецярбург. Колькі маглі б расказаць яго сівыя камяні пра крывавыя бai і перамогі, пра нязломны дух колішніх палачан. Гэта яны расказвалі адзін аднаму казку пра светлы і шчаслівы горад, што, як прывід, з'яўляецца і знікае на ўзбярэжжы Дзвіны...

А горад ёсць і светлы, і сонечны, дзівосны, як казка, узнёслы, як песня. І дарога да яго ідзе па асфальтавай магістралі, што імчыцца ўздоўж Дзвіны праз палі і пералескі. Горад ёсць на ўзбярэжжы ракі, што звоніць сваімі хвалямі ў сівую Балтыку. Гэтую раку за межамі беларускай зямлі на нявучай мове латышоў завуць Даўгавай.

А гэтаму гораду толькі некалькі дзесяцігоддзяў. Ён пачынаўся невялікім кастром і бадзёрай песняй у ліпеньскі вечар тысяча дзевяцьсот пяцьдзесят восьмага года. Спачатку яго проста звалі Нафтабуд, цяпер — Наваполацк. (Паводле С. Грахоўскага).

Музыка ў бары

Якое раздолле ў зялёным бары летам! Колькі прастору тут для забавы, колькі дзіваў усякіх пабачыш!

Вунь па высокіх кучаравых хвоях і елках смела разгульваюць шустрыя жартаўлівыя вавёрачкі. Яны спрытна зрываюць сухія шышкі ды, спяшаючыся, нясуць у свае гнёзды. І якія працавітыя, руплівыя звяркі — гэтыя маленькія рыжыя вавёрачкі з доўгімі пушыстымі хвосцікамі! Праз усё лета заняты яны работай. Што ж, голад — не цётка, ды і малых гадаваць трэба.

Доўгахвостыя дзятлы ў чорных вопратках з чырвонымі палоскамі заняты звычайнай работай: адны шукаюць у бары на абед казюлек, другія будуюць жыллё не толькі сабе, а і ўсім, каму яно з лясных жыхароў патрэбна.

Розныя дробныя птушкі пырхаюць між галля. Дружным хорам шчабечуць шпакі, весела пасвістваюць івалгі і дразды. А часта прылятаюць сюды з ліставых лясоў і шэрыя зязюлі-непаседы. Хоць і небагата знойдзеш тут вусеняў, затое ёсць дзе пастроіць сваё патомства ды і накукавацца можна ўволю, забраўшыся далей ад людскога вока.

І такая дзіўная музыка гучыць у бары. (Паводле А. Якімовіча.)

У Белавежскай пушчы

Многа ёсць у Беларусі куткоў з дзівоснай прыродай. Але Белавежская пушча ў кожнага, хто пабываў там, пакідае незабыўнае ўражанне. Тут нібы сабраны ў некранутым выглядзе ўзоры прыроды з усёй Беларусі. У любую пару года пушча жыве сваім асаблівым жыццём.

Стралой прамільгне ў зарасніку беланогі прыгажунлось. Выйшаўшы на паляну і горда ўзняўшы галаву, насцярожана ўслухоўваецца ў гук і шолагі алень. Зрэдку можна ўбачыць, як пасвіцца на лугавіне грацыёзная казуля. Дзесьці патаемнымі сцежкамі прабіраецца на пашу сям'я дзікіх свіней. Ноччу вылазіць з нары, каб паласавацца, янотападобны сабака. А на дрэвах гаспадарыць вораг птушак і вавёрак куніца, падпільноўвае здабычу драпежная рысь.

Аднак гордасцю пушчы з'яўляецца зубр. З масіўным тулавам, буйной барадатай галавой, ён робіць унушальнае ўражанне. Непаваротлівы з выгляду зубр у хвіліны злосці надзвычай небяспечны і для чалавека. Не так даўно зубры ўтрымліваліся ў загарадцы. А сёння, за выключэннем некалькіх, што знаходзяцца ў вальеры, усе яны свабодна блукаюць на пушчы парамі ці невялікімі групамі. І не было выпадку, каб яны першымі без прычыны нападалі на чалавека. (Паводле В. Вольскага.)

У свеце слоў

Суткі

Суткі складаюцца з дня і ночы. Славянскае *нокть* узыходзіць да індаеўрапейскага *некут* — змяркацца. *Дьнь* (таксама славянскае слова) узыходзіць да індаеўрапейскага *дін* — свяціць. У старажытнарускай мове *дьнь* азначала *рабочы час, светлы час, свята* і інш. У праславянскі перыяд яно атрымлівае далейшае семантычнае развіццё, на базе яго фарміруецца новае слова *суткі*. А звяном да гэтага было спалучэнне *стык дня і ночы*. У сучасных славянскіх мовах ёсць наступныя словы для абазначэння сутак: чэшскае *ден*, балгарскае *денонощие* (у старажытнарускай мове было *нощедьнь*), украінскае і польскае *доба*, расійскае *сутки*.

І. Шпадарук.

(Працяг. Пачатак у №№ 5—24).

— ...Я прачытаў вашы матэрыялы, але ўсё ж так і не зразумеў, што ад мяне патрабуецца. Тут не сфармулявана праблема.

(— Праблема — гістарычны лёс беларускай мовы, яе сучасны стан, перспектывы... Ваша ўспрыманне пададзеных мной фрагментаў... Можа б вы напісалі мне некалькі слоў, ці я б вас з аловачкам паслухаў...)

развіццё, росквіт кожнае мовы і культуры. І гэты працэс трэба не тармазіць ці пакідаць самацёк, а падтрымліваць. Высокаінтэлігентныя нашчадкі змогуць з усяго моўнага і культурнага багацця народаў узяць самае істотнае, адпавядаючае іх запатрабаванням.

Часта, калі заходзіць гутарка аб адзінай мове Зямлі, гавораць, што такой мовай будзе руская ці англійская.

Алег БЕМБЕЛЬ

З «падпольнай» кнігі

— Я к этой проблеме не хочу иметь никакого отношения!.. Я не хочу быть к этому делу причастен ни в коей мере...

То, что здесь делается упор на национальные чувства — это попахивает национализмом...

То, что «мова вечная» — это попахивает антимарксизмом...

Это — надуманная проблема!..

Вот, скажем, особенности беларускай мовы — это проблема. Проблема словарного состава... Сколько, например, общих слов в белорусском и русском языках — это проблема...

Считайте, что я ничего не читал и что мы с вами ни о чём не говорили.

Кому передать ваши материалы?..

(Паміж 40 і 50, беларус, вясковы настаўнік з Мядзельшчыны)

Выказванні пра беларускую мову ў «падборках» і бытуючыя погляды прагматыкаў канфліктуюць. Прагматык кажа: навошта беларуская мова, толькі час на яе вывучэнне траціць?

— дзяржаўнай яна не стала — заменена рускай;

— у навучальных установах яе не ўчуеш; карыстаюцца ёю толькі на вёсцы, ды і там моладзь па-руску спрабуе размаўляць. З адукаваных людзей толькі моваведы і літаратары ёй карыстаюцца, бо гэта іх хлеб, а радыё, часопісы і газеты — па палітычных меркаваннях — каб БССР членам ААН засталася. Прагматык кажа — не трэба мова, бо няма з яе выгады.

Тут варта, мне здаецца, прыгадаць біблейскую прытчу, дзе сказана, што «не хлебам адзіным жывы чалавек». Да мовы, як і да культуры наогул, нельга ставіцца з меркай мешчаніна: выгадна ці не. Мова — гэта душа народа, і тут шукаць выгады — гэта блюзнерства над самым запаветным.

Вышэйшая форма грамадства — камунізм — можа быць пабудавана толькі высокакультурнымі, усебакова адукаванымі і выхаванымі, інтэлігентнымі ў шырокім плане, працавітымі людзьмі, уся дзейнасць якіх будзе характарызавацца высокім гуманізмам і эстэтычнасцю. Апорай душы чалавека камуністычнага заўтра будзе прыгожае. Эмацыянальны бок людзей павінен бесперапынна расці, шліфавацца.

Усё развіваецца ў выніку барацьбы. Такой барацьбой, на маю думку, павінна быць не выцясненне і падаўленне адной мовы ці культуры другой, носьбіт якой больш шматлікі ці займае зручнае становішча... а ўсебаковае

А ці ўсё дасканала ў гэтых мовах? Я не спецыяліст, сцвярджаць штосьці акрэсленае ў карысць аднае ці другой не буду, але ў адным перакананы, што мова Зямлі павінна ўзяць ад **кожнай** мовы свету яе самае адшліфаванае, прыстасаванае, удасканаленае... З тае далечыні, з «лесу» агульначалавечае мовы і духу будзе добра відаць каштоўнасць, сацыяльна-духоўны сэнс кожнага нацыянальнага моўнага «дрэва»...

А зараз... Цяпер, калі гэты этап не наступіў, людзі, якія забылі сваё мінулае, сваю культуру, сваю мову, ператвараюцца ў табун, які жадае толькі аднаго — набіць бруха або кішэню.

На голым, забруджаным, вытаптаным месцы не вырасце замілаванне да прыроды. Хто не палюбіў дрэва ля хаты — не зразумее прыгажосці прыроды ў цэлым. Хто не любіць бацькоў, блізкіх — не зможа быць гуманістам. Без ведання свайго нацыянальнага гераічнага мінулага хіба магчыма воінская мужнасць і грамадзянская доблесць? Хто кінуў сваю мову і культуру — не зможа ўсеабдымна і глыбока зразумець душу другіх народаў.

Усё лепш відаць у параўнанні. Возьмем літоўцаў, латышоў. Яны цвёрда трымаюцца сваёй мовы і культуры. Да другіх моў і культур яны ставяцца з разуменнем, паважаюць іх, бяруць з саюзнае і сусветнае скарбонкі ўсё лепшае, перакладаюць на сваю мову, надаюць яму нацыянальны каларыт і карыстаюцца. Гэтак жа робяць і другія народы. Чаму беларусы павінны быць белай варонай?

Іншы раз кажуць, што цяпер раздарожжа, беларусы пацерпяць без роднае мовы. Затое ў будучым выйграюць беларусы, калі запануе руская мова... Тут вее рэлігійным містыцызмам... цяпер пацярпім — а ў раі «воздастся». Я лічу, што **цяпер** трэба даць чалавеку ўсё, што яму **зараз** патрэбна, не адкладаючы на будучае.

(Паміж 30 і 40, беларуска, мовазнаўца)

Беларуская мова... родная мова... Яе не трэба абараняць, але шанаваць трэба. Яна, як і кожная з'ява прыроды — дрэва, кветка, мае права на жыццё і жыве. Мы яе чуем на вуснах старых дзядоў і бабуль, на вуснах малалетак і маладзіц. Гэта — сакаўная мілагучная і магутная мова. Слова яе перадае ўсё, што трывожыць і радуе чалавека, усё, чым жывіцца і чаго прагне яго душа. Але яна здатная і да навукі, да высокіх матэрыяў розуму. Яна добра паслужыць і адукаванаму чалавеку, калі ў яго чуйнае вуха...

(Працяг будзе).

МАМА, ПАЧЫТАЙ!

Максім ТАНК

Ехаў казачнік Бай



— Ехаў казачнік Бай
Цераз сёлы і гай.
Баіць ці не?
— Бай!

— Ён пытаўся ў мяне,
Што даць дзецям у сне?
Баіць ці не?
— Бай!

— Я прасіў: дзецям дай
Казку-песеньку, Бай!
Баіць ці не?
— Бай!

— Казку,— кажа,— я дам,
Толькі выберу сам.
Баіць ці не?
— Бай!

— А найлепшую з іх
Дам для самых малых.
Баіць ці не?
— Бай!

— Тым, хто любіць мяне
І хто першы засне.
Баіць ці не?
— Не!

Пудзіла

— Ой, дзяўчаткі, што рабіць,
Як канаплі бараніць
Ад вераб'ёў?

— Пастаў, Янка, свой кіёк,
На яго надзень мяшок.
— Усё роўна лятуць!

— Дай пудзілу памяло,
Сваю шапку — на чало!
— Усё роўна дзяўбуць!

— Зрабі з лыка добры лыч,
Люльку ты яму пазыч!
— Не баяцца!

— Ну дык сам тады вясной
На каноплішчы пастой.
— Вераб'і ўцяклі!

Ніна ГАЛІНОЎСКАЯ

Гусак-фігурыст

У гусака ад рання
Фігурнае катанне.
Паставіў ён пласцінку —
Вясёлую «Калінку».
— Танцуе хвацка, гляньце,
Як на чэмпіянаце,—

Дзівуюцца глядачкі —
Чубаткі, гускі, качкі.
— Трайное робіць сальта.
Узнагародзіць варта.
— Выдатны фігурыст.
— Гусак у нас артыст!



Васіль ЗУЕНАК

У мяне на агародзе

У мяне на агародзе
Пяць жырафаў узыходзіць,
Леапард пусціў карэнне,
Раскусціліся алені,
Слон пайшоў дзябёла
ў ствол,
Кобра сцелецца на дол,
Зацвітае бегемот —
Развясёлы агарод!..



З гісторыі беларускага партрэта

«Тое, што вы прачытаеце ў гэтай кніжцы — толькі частка не напісанай яшчэ гісторыі беларускага партрэта. Як і іншыя жанры выяўленчага мастацтва Беларусі, ён вывучаны недастаткова, каб можна было ўзяць на сябе смеласць разгарнуць перад чытачом цэласную панараму развіцця партрэта за тыя стагоддзі, што ён існуе на нашай зямлі. «Мы раскажам, што стаяла ля яго вытокаў, чаму менавіта XVI — XVII стст. з'явіліся перыядам росквіту партрэта, як грамадскія і палітычныя ўмовы ўплывалі на яго жыццядзейнасць»,— так пішуць Юрый і Аляксей Хадыкі ва ўступным слове да сваёй кнігі «Непаўторныя рысы», якая выйшла ў выдавецтве «Навука і тэхніка».

Кніга складаецца з раздзелаў «Старадаўнія партрэты — позірк у мінулае», «Подых бурлівых часоў», «Мецэнаты і рыцары. Вытокі беларускага партрэта сармацкага тыпу», «Эпоха росквіту сармацкага партрэта» і «Пошукі новага жывапіснага стылю».

Сармацкі партрэт — адна з самых выдатных старонак беларускага мастацтва. У XVI — XVII стст. ён быў шырока распаўсюджаны не толькі ў Беларусі, Польшчы, Літве і на Украіне, але і ў іншых славянскіх краінах. Знаёмячыся з творамі тых далёкіх часоў, можна адчуць душой эпоху, адчуць яе дух, настолькі адлюстравана мастакамі жыццё нашых продкаў. У кнізе шмат ілюстрацый (праўда, ім бракуе якасці), і думаецца, што гэтая кніга можа служыць для ВНУ Беларусі добрым падручнікам па гісторыі беларускага мастацтва. На жаль, хоць у анатацыі і напісана, што кніга «разлічана на шырокае кола чытачоў», наклад яе зусім мізэрны — 1120 паасобнікаў.

В. Ш.

«Тэатральная Беларусь»

Чытачы не так даўно атрымалі трэці нумар часопіса «Тэатральная Беларусь», пазначаны маем — чэрвенем гэтага года. У ім надрукавана некалькі цікавых літаратурных твораў, у прыватнасці сатырычная камедыя-плакат у адной дзеі і дзвюх карцінах «Незвычайныя пацыенты» Алеся Махнача, трагіфарсавая замалёўка ў адной дзеі «Чарга» Яўгена Міклашэўскага і п'еса ў адным акце «Заручыны Паўлінкі» вядомага беларускага драматурга Францішка Аляхновіча. Тут жа змешчана падборка фотаздымкаў з архіва Сяргея Панізьніка, спалучаных з імем Францішка Аляхновіча, якое пасля доўгага забыцця нанава адкрываецца для чытачоў і гледачоў.

«Цяга да драматургіі жыла пастаянна» — гутарка крытыка Алеся Марціновіча з пісьменнікам Іванам Чыгрынавым. Сумную гісторыю Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра, які воляю лёсу апынуўся на вуліцы, распавядае ў сваім невялікім артыкуле «Смех скрозь слёзы» Тамара Гаробчанка. Другі яе артыкул «Не саромцеся беларускасці» — рэцэнзія на кнігу добра вядомага на Беларусі журналіста і паэта Георгія Валкавыцкага «Віры. Нататкі рэдактара». «І мроіцца вёсачка, рэчка Дзісёнка...» — публікацыя Барыса Бур'яна пра творчасць народнага артыста Беларусі Паўла Дубашынскага. Пра тое, як святкуюцца калядкі ў Давыд-Гарадку, чытачы даведаюцца з невялікай нататкі Яўгена Адамовіча «Давыдгарадоцкія калядкі». «Жыццё, аддадзенае сцэне» — некалькі штрыхоў да творчага партрэта народнай артысткі Беларусі Ларысы Пампееўны Александроўскай. «Знаёмцеся: ансамбль «Спадчына» — невялікая нататка Людмілы Ляонавай пра творчую дзейнасць пакуль што малавядомага ў нас фальклорнага калектыву, створанага пры гарадскім Доме культуры Дзяржынска.

У мастацкім афармленні часопіса выкарыстана шмат ілюстрацый, фотаздымкаў.

Л. БАРШЧЭЎСКАЯ.



Шэдэўры сусветнай паэзіі па-беларуску

Рубрыку вядзе
Лявон БАРШЧЭЎСКІ

Пачатак італьянскага Адраджэння даў сусветнай паэзіі яшчэ аднаго вялікага паэта — Франчэска Петрарку (1304—1374), лірычная спадчына якога таксама чакае свайго беларускага перакладчыка.

Франчэска ПЕТРАРКА

* * *

У песнях, што спяваў я вам, ніколі
Не быў фальшывы нават лёгкі ўздых —
З часоў пакут кахання маладых,
Калі не думаў я аб лепшай долі.

Хай верш мой, што сваёй не здрадзіў ролі —
Пераадольваць крах надзей пустых,—
Цяпер заслужыць не папрокаў злых
Ад палкіх закаханых, а патолі.

Бо зразумеў я, што мяне народ
Даўно ўжо высмеяў. І сам я смешны
Сабе з-за вечнай марнай мітусні.

А вынік даўняй пыхі ды турбот —
Я каюся, зніштожаны і грэшны,
Бо ўсе зямныя ўцехі толькі сніў.

* * *

Як вечнае жыццё спазнае той,
Хто аднаго спрагнёны — бачыць Бога,
Я ад кароткага жыцця зямнога
Хацеў бы сціплай радасці адной —

Каб Вы, Мадонна, Вашаю красой
Далі мне ўцехі, хоць і не замнога:
Жадання не зракуся я такога
І буду жыць надзеяю сваёй.

Ды прамянецца ўсё; час — хуткаплынны:
Кагосьці пад блакітным нашым небам
Заўжды агонь жывіў, вада жывіла,

Кагосьці — дотык альбо пах расліны.
А мне нічога гэтага не трэба:
Што б засціць мне магло Ваш вобраз мілы?

* * *

Я жыў, не наракаючы на лёс,
І зайздрасць сэрца мне не працінала.
Хай іншы быў шчаслівейшы — німала
Не праліваў па тым я горкіх слёз.

Пагляд вачэй, што шмат пакут прынёс
Душы маёй, якая ўсё стрывала,—
Яго імгла навечна пахавала,
І болей ён не свеціць мне з нябёс.

Прырода-матухна, паказвала ты ўсім
І жорсткасць, і спагаду неаднойчы,
І несла згубу парасткам сваім.

Усё вытокам жывіцца адным —
Ды як дазволіў ты, нябесны Ойча,
Цябе вось так абрабаваць зусім?

Пераклад з італьянскай
Лявона БАРШЧЭЎСКАГА.

Проза

Дональд УЭСТЛЭЙК

ДРАМА НА ВОСТРАВЕ

(Апавяданне)

(Заканчэнне. Пачатак у № 24).

Двойчы гэта здарылася, і давялося скарыстаць каштоўныя запалкі, каб зноў распаліць вогнішча. Абодва разы яны супакойвалі адно аднаго, кажучы, што наступным разам яны пастараюцца так дбайна прыкрыць вогнішча, што яно не згасне.

Але прыйшоў дзень, калі яна перапыніла яго размову пра адзін з закончаных на той час раздзелаў.

— Ты ўжо даўно не пішаш нічога новага. З тае пары, як я ўпершыню прыйшла сюды.

Ён здзівіўся, што яна абарвала ход яго думкі, і зразумеў, што сказала яна праўду.

— Добра,— згадзіўся ён,— я сёння ж пачну новы раздзел.

— Я кахаю цябе,— сказала яна ў адказ.

Пачаць новы раздзел было не так проста. Папраўдзе, ён дык нават і не хацеў яго пачынаць. Яму так падабалася чытаць ужо закончаныя раздзелы!

Яна пачала настойваць на сваім, і, упершыню з таго дня, як раздзяліла ягоную адзіноту, ён пакінуў яе. Ён пайшоў на другі канец вострава і сядзеў на беразе, углядваючыся ўдалечыню.

Праз нейкі час яна прыйшла і папрасіла ў яго прабачэння. Яна маліла прачытаць яшчэ раз закончаныя раздзелы, і пасля доўгіх угавораў ён абняў яе і дараваў.

Але потым яна зноў загаварыла пра гэта, а потым яшчэ і яшчэ раз, кожны раз усё больш настойліва, і дайшло да таго, што неяк ён агрызнуўся:

— Ды перастань ты мяне пілаць!

І яна разрыдалася.

Стала ўжо відавочным, што яны дзейнічаюць адно аднаму на нервы, больш таго, паступова ён пачаў заўважаць, што ўчынкі Дорын усё больш і больш нагадваюць яму маму — адзіную жанчыну, якую ён добра ведаў. Гэтаксама, як і мама, яна бачыла ў ім сваю ўласнасць, не пакідала яго ні на хвіліну, не давала яму магчымасці адасобіцца і спакойна падумаць. Апрача таго, яна была, як і мама, патрабавальная і няспынна настойвала, каб ён праявіў характар і прадоўжыў працу над кнігаю. Часам яму пачынала здавацца, што яна хоча, каб ён зноў стаў простым клеркам.

Сваркі перайшлі ў скандалы, і скончылася тым, што ён ударыў яе. Спачатку Дорын усё роўна як здранцвела, потым плакала, і ён прасіў прабачэння, цалаваў ёй рукі і тую шчаку, дзе на пяшчотнай скуры ярка гарэў след ягонай пяцярні, ласкава гладзіў, і яна супакоілася і пакорліва сказала, што даруе яму.

Але іх адносіны ўжо не маглі стаць ранейшымі. Дорын усё больш сварылася і надакучала і ўсё больш станавілася падобнай на маму. Нават знешне яна выглядала цяпер копіяй мамы ў маладосці. Асабліва нагадвалі маму вочы, пагляд якіх зацвярдзеў і страціў нябесны блакіт, і голас, такі ж высокі і рэзкі.

Ён пачаў замыкацца ў сабе, мог гадзінамі маўчаць, утойваючы ад яе свае думкі. Калі ж яна дазваляла сабе перашкаджаць яму думаць і ласкава, як раней, дакраналася да яго рукі ці, часцей, зноў заводзіла размову пра тое, што ён не працуе над кнігаю, то ён глядзеў на яе, як на нахабу, што лезе не ў сваю справу. Не тоячы злосці, ён пачынаў крычаць, патрабуючы пакінуць яго ў спакоі. Але пазбавіцца ад яе было немагчыма.

Хутчэй за ўсё ў адзін з такіх момантаў мільганула думка аб забойстве і, з'явіўшыся раз, ужо не выходзіла з ягонай галавы. Ён спрабаваў адагнаць яе, пераконваў сябе, што ён не здатны забіць, што ён усяго толькі бухгалтар, маленькі, слабахарактарны, ціхі і нерашучы чалавек.

Але гэта было не так, і ён ведаў гэта. Цяпер ён ужо сапраўдны шукальнік прыгод, марскі воўк, астралянін, якога лёс закінуў у самую сярэдзіну ціхаакіянскай прасторы, загарэлы і сухарлявы, на зайздрасць усім бедным і нікчэмным бухгалтарам ва ўсіх душных канторах свету. І ён — гэта ўжо Джым Кілбрайд ведаў дакладна — на забойства здатны.

Дні і ночы ён праседжваў ля свайго маленькага вогнішча, узіраючыся ў язычкі полымя, і абдумваў забойства, у той час як Дорын, не здагадваючыся аб ягоных намерах, не ведаючы, што сваімі паводзінамі яна адно набліжае свой канец, працягвала назаляць яму і патрабавала ад яго заняцца кнігаю. Яна займела звычку сядаць побач ля вогнішча і атручваць яму жыццё пастаяннымі патрабаваннямі прынесці больш кары і галін, каб не даць агню зноў згаснуць, як ён гэта дапускаў ужо двойчы, і ў яго ўсё так і закіпала ўсярэдзіне ад несправядлівасці абвінавачванняў. Бо гэта ж штормы, а не ён, гасілі вогнішча.

— Але,— настойвала яна,— шторм не згасіў бы вогнішча, калі б ты больш клапаціўся аб ім.

Нарэшце, цярпенню ягонаму надышоў канец. У першыя шчасныя дні ўдваіх яны любілі купацца разам ля берага, не заплываючы далёка з-за боязі акул ды іншых небяспечных драпежнікаў. Ужо даўно яны не заходзілі ў ваду, і вось, неяк аднойчы, ён усё роўна як мімаходам, хітра прапанаваў схадзіць акунуцца.

Яна адразу ж згадзілася, і, скінуўшы адзежу, яны разам пабеглі да вады, дзе сталі плюхацца ды смяяцца, быццам усё яшчэ кахалі адно аднаго і адно аднаму радаваліся. Ён акунуў яе ў ваду з галавою, як часта гэта рабіў у добрыя старыя дні, і яна вынырнула, смеючыся і адфыркваючыся. Потым зрабіў гэта яшчэ раз, але гэтым разам утрымаў яе пад вадою.

Яна змагалася адчайна, але ягоныя мускулы даўно сталі дужымі і гнуткімі, і ён трымаў яе мёртвай хваткаю ўвесь час, пакуль яе спробы вырвацца не сталі слабець і потым не перапыніліся зусім. Тады ён адпусціў яе і глядзеў, як адліў зносіць мёртвае цела ў акіян, як гэтае пяшчотнае цела бязвольна пагойдваецца на хвалях, блакітныя вочы заплюшчаны, залацістыя валасы патанулі ў вадзе. Стомлена спатыкаючыся, ён выбраўся на бераг і зваліўся на пясок.

Цяпер ён быў адзін. Зусім адзін.

Перцшыя згрызоты сумлення ён адчуў ужо назаўтра. Яму згадаўся яе голас, яе твар і шчасце іх першых дзён разам. Ён сабраў і склаў у памяці абломкі ўсіх прычын іх бясконцых сварак і вылучыў усе выпадкі, калі праўда была не на ягоным баку. Стала відавочным, што ён быў несправядлівы да яе і заўсёды думаў толькі пра сябе. Яна хацела, каб ён закончыў кнігу, хацела не дзеля сябе — яна думала адно пра яго. Ён быў нястрыманы і грубы, і гэта ён вінаваты ў тым, што сваркі пачалі перарастаць у скандалы і што яны пачалі гідзіцца адно аднаго.

Ён падумаў пра тое, з якой радасцю згадзілася яна пайсці з ім купацца, і зразумеў, што яна ўспрыняла ягоную прапанову як крок да згоды.

Усе гэтыя думкі выклікалі ў ім пачуццё невыноснага сораму і раскаяння. Ва ўсім ягоным жыцці яна была адзінай жанчынаю, якая адказала на яго каханне і бачыла ў ім не проста маленькага бухгалтара, які гадамі гібеў над гросбухамі ў цеснай канторы, а ён забіў яе!

Ён шаптаў яе імя, але яна пайшла назаўсёды, яна памерла, і гэта ён — забойца яе!

Ён расцягнуўся на пяску і горка заплакаў.

Ішлі тыдні, і хоць яму жахліва не хапала яе, ён патроху скарыўся са стратаю. Ён адчуў, як нешта вельмі важнае і вельмі сумнае быццам перакуліла ягонае жыццё і назаўсёды змяніла яго. Сумленне яго пакутавала праз здзейсненае забойства, але пакута гэтая была салодкая.

Праз пяць месяцаў яго ўратавалі. З крутабокага шэрага парахода спусцілі шлюпку, якая падышла да вострава, і з дапамогаю матросаў ён няўклюдна ўзабраўся ў яе. Яму дапамаглі падняцца па вяровачнай лесвіцы на палубу, накармілі яго, паклалі спаць і, калі ён адпачыў, прывялі да капітана.

Невысокі сівы капітан у выгаралым на сонцы кіцелі паказаў яму на крэсла і запытаўся:

— Як доўга вы прабылі на востраве?

— Я не ведаю.

— Вы былі адзін?

— Не. Са мною была жанчына, Дорын Пальмэр.

— Дзе ж яна? — здзівіўся капітан.

— Яна памерла, — зарыдаў ён і расказаў усё, як было. — Мы біліся, псавалі адно аднаму нервы, і я забіў яе. Я ўтапіў яе, і цела знесла ў акіян.

Збянтэжаны, капітан пазглядзеў на яго, не ведаючы, што сказаць ці зрабіць, і ў выніку вырашыў не рабіць нічога, а проста здаць чалавека ўладам па прыходзе ў Сіэтл.

У Сіэтле паліцэйскія выслухалі спачатку заяву капітана, а потым узяліся за Джыма Кілбрайда. Ён адразу ж прызнаўся ў забойстве, заявіўшы, што ўвесь гэты час ягонае сумленне пакутавала. Гаворка ягоная была звязная, лагічная, ён адказваў на ўсе пытанні, падрабязна апісваў сваё жыццё на востраве, злачынства, якое ён здзейсніў, і ніхто нават і не падумаў, што ён можа быць не зусім нармальным. Стэнаграфіст запісаў ягонае прызнанне, і ён падпісаў яго.

У турме яго наведалі старыя сябры па працы. Яны разглядвалі яго з цікавасцю і здзіўленнем. Выявілася, што па-сапраўднаму яго ніхто не ведаў. Ён усміхнуўся і прыняў як належнае іх зайздрасць.

На працэсе яго сумленна абараняў назначаны судом адвакат, і Кілбрайд быў прызнаны вінаватым у наўмысным забойстве. У судзе ён паводзіў сябе спакойна, годна, і ніхто не мог паверыць, што некалі гэты чалавек быў дробным клеркам. Яго прысудзілі да пакарання смерцю ў газавай камеры і належным чынам выканалі прысуд.

Пераклаў з англійскай
Алесь АСТАШОНАК.

ВЫСТАВЫ





Новая экспазіцыя «Прэм'ера твора» адкрылася ў мастацкай галерэі «Медэя» ў Менску. Галерэя, вядомая сваімі выставамі — распродажамі мастацкіх твораў, на гэты раз прапанавала выставу, складзеную, у асноўным, з новых работ жывапісцаў, графікаў, скульптараў, мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога накірунку мастацтва. Сярод выстаўленых работ — творы Я. Батальёнка, Ф. Драгуна, У. Скулкоўскага, В. Хадаровіча і іншых.

НА ЗДЫМКАХ: новая экспазіцыя галерэі «Медэя»; В. Ткачоў — «Людзі і птушкі».

Фота Яўгена КАЗЮЛІ (БелТА).

Чыталі?

«Роднае слова»

Майскі нумар часопіса «Роднае слова» пачынаецца з нататкі пра тое, як вядзецца падрыхтоўка да акадэмічнай канферэнцыі па беларускім правапісе. Гаспадарскі клопат пра ўнармаванне правапісу ёсць і ў артыкулах аб беларускіх найменнях хімічных элементаў, аб правапіснай норме, накшталт *бярэм, нясем.* У гэтым жа раздзеле — «Школа і нацыянальнае адраджэнне» — працяг размовы пра змест літаратурнай адукацыі ў нашых школах.

Часопіс змяшчае матэрыялы, у якіх з розных пазіцый разглядаюцца асаблівасці творчасці народнага песняра Янкі Купалы, празаікаў Леаніда Дайнекі, Вячаслава Адамчыка, больш маладых пісьменнікаў Алеся Асташонка, Адама Глобуса, Андрэя Федарэнкі, Анатоля Казлова. Падаюцца артыкулы па методыцы выкладання мовы (у прыватнасці, аб выкарыстанні на ўроках апорных канспектаў). Нататкі па гісторыі беларускага мовазнаўства (са спадчыны Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага) ілюстраваны цікавай картай, складзенай паводле работ вядомага даследчыка-беларусіста. На ёй паказана пашыранасць беларускіх гаворак на тэрыторыях па-за межамі сучаснай Беларусі.

У раздзеле «Калі закончыўся ўрок» змешчаны матэрыялы для арганізатараў беларускамоўных летнікаў.

Раздзел «На ростанях» пачынаецца нататкамі пра купалаўскія мясціны на Меншчыне. У ім падаецца таксама матэрыял пра мастакоўскі талент Уладзіслава Галубка. У артыкуле «Перад мінуўшчынай і вечнасцю» ідзе размова пра неабходнасць паважліва ставіцца да месцаў апошняга людскога спачынку, шанаваць памяць продкаў.

Часопіс знаёміць чытачоў з творчасцю і развагамі пра надзённае і вечнае мастака Міколы Купавы, адзначае ўгодкі асобных літаратараў, змяшчае вершы выкладчыка з Магілёва Васіля Рагаўцова.

Іван ЖДАНОВІЧ,
супрацоўнік рэдакцыі часопіса.

Анатоль ЦЫРКУНОЎ

Будні пекла

(дыялог двух катаў)

КАТ-ВЫКАНАЎЦА:

«Я расстрэльваў ворагаў народа...
Шмат іх панавезлі ў Курапаты,
Шмат іх я забіў сваёй рукою,
Я заўжды ў патыліцу страляў...
У Катыні польскіх афіцэраў
Я забіў таксама больш за сотню,
Быў я паслухмяным выканаўцам,
Дык за што ж мне выпаў лёс такі...
Самаго, як ворага народа,
Без суда і следства расстралялі,
Атрымаў ў патыліцу я кулю,
Што яшчэ страшэнней можа быць?»

КАТ-ІДЭОЛАГ:

«Калі ты расстрэльваў шмат палякаў,
Дык дапамагаў тым самым немцам,
З немцамі ж палякі ваявалі,
Што ж ты, і газеты не чытаў?
Да таго ж знішчаў ты афіцэраў,
Што маглі служыць у Войску Польскім
І змагацца з немцамі са зброяй —
Значыць, ты нямецкі быў шпіён...
Венгры з немцамі былі ў саюзе,
Значыць, ты й венгерскім быў шпіёнам,
Быў ты і румынскім дыверсантам,
Італьянскім быў ты недабіткам,
Фінскім і японскім да таго ж...
Сем разоў цябе б расстрэльваць трэба,
А ўсяго аднойчы расстралялі,
Дык на што ж яшчэ ты спадзяваўся,
І які чакаў ты прыгавор?»

АД АЎТАРА:

«І ў казцы ёсць асобае гучанне,
Калі кат кату робіць навучанне».



ЛЯЧЭННЕ МЁДАМ ХВАРОБ ОРГАНАЎ ДЫХАННЯ

У старажытнасці мёдам лячылі кашаль — Авіцэна сцвярджаў, што ад яго дапамагаюць лясныя арэхі з мёдам. Ён таксама рэкамендаваў ужываць сумесь мёду з пялёсткамі ружы на пачатковай стадыі туберкулёзу.

Пра асноўныя способы лячэння мёдам запалення горла (фарынгіт, ларынгіт) мы расказалі ў № 14 нашай газеты. Імі з'яўляюцца мясцовыя аплікацыі ў нос, прыём унутр, паравыя інгаляцыі, паласканне.

Што да хранічных бранхітаў і трахеабранхітаў, то яны лечацца мёдам у камбінацыі з хіміятэрапеўтычнымі сродкамі. Распрацавана методыка лячэння аэразольнымі інгаляцыямі ва ўмовах паліклінікі. Штодзённа хворым робяць па дзве інгаляцыі, і на працягу курса лячэння яны прымаюць па 100—150 г. мёду невялікімі порцыямі, затрымліваючы яго як надаўжэй у роце. Лячэнне працягваецца 20 дзён, а пры неабходнасці і больш. На курс прыпадае 30—40 інгаляцый. Хворым з цяжкай формай бранхіту можна падоўжыць тэрмін лячэння да 40 дзён пры адной-дзвюх інгаляцыях у дзень.

Пчаліны мёд — выдатны сродак для лячэння туберкулёзу лёгкіх, аднак прыпісваць яму спецыфічныя лекавыя ўласцівасці ў гэтым выпадку нельга. Ён умацоўвае арганізм, павышае яго імунабіялагічныя засцерагальныя сілы, што садзейнічае знішчэнню туберкулёзнай інфекцыі.

Некалькі рэцэптаў

1. Пры хранічным танзіліце рэкамендуецца змазваць нёбныя міндаліны сокам алоэ, змешаным з натуральным мёдам у суадносінах 1:3, штодзённа на працягу 2 тыдняў, а затым наступныя два тыдні змазваць праз дзень. Працэдуру праводзіць нашча.

2. Пры фарынгіце, трахеіце, ларынгіце піць чай з кветак алтэі з мёдам: 1 чайная лыжачка кветак на шклянку кіпню. Прымаць па адной сталовай лыжцы некалькі разоў на дзень.


3. Пры бранхіце і астме (як адхарквальны і мачагонны сродак) дапамагае цёплы чай з кветак лугавой канюшыны з мёдам.

4. Пры бранхіце і туберкулёзе лёгкіх:

а) Узяць 100 г мёду, 100 г сметанковага масла, 100 г гусінага тлушчу, 15 г соку алоэ, 100 г какавы. Сумесь нагрэць, не даводзячы да кіпення. Прымаць па сталовай лыжцы на шклянку гарачага чаю або малака раніцай і вечарам.

б) 150 г соку алоэ, 250 г мёду, 350 г віна «кагор». Сумесь настойваць у цёмным месцы на працягу тыдня. Прымаць па сталовай лыжцы тры разы на дзень за 30 мін. да яды.

Згуляем у шашкі



Мікалай Чэрній прапанаваў чытачам «Нашага слова» новую шашачную пазіцыю, у якой неабходна пасля ходаў: e7—f6, e3—d4 і f8—e7 — белым знайсці выйгрыш. Пазіцыя ўзята з трэніровачных партый. Свае рашэнні і прапановы дасылайце на адрас рэдакцыі.

Наш адрас: 220005, г. Менск, **вул. Румянцава, 13.**
Тэлефон рэдакцыі: 33-17-83.

МВПА імя Якуба Коласа.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная Зорка».
Наклад 7152 паасобнікаў. Зак. 1183. Індэкс 63865.